**Беларускі “Зялёны палац” убачыць у Капенгагене**

Калі раптам на вуліцы вы сустрэнеце людзей, якія прапануюць вам пафарбаваць указальны палец у зялёны колер, не спяшайцеся адыходзіць: унясіце сваё "я" ў вырашэнне сусветных экалагічных праблем! Для гэтага варта паўдзельнічаць у акцыі "Зялёны палец".

Што такое "Зялёны палец"? Любы чалавек фарбуе палец у зялёны колер, а на далоні піша назву таго, што ён хоча выратаваць ад знікнення з-за экалагічных праблем і захаваць для нашчадкаў. Пасля гэтага трэба абавязкова сфатаграфавацца, каб быў бачны ваш твар, далонь і назва выратаванага паняцця.

Такая акцыя накіравана на актыўны ўдзел насельніцтва Зямлі ў прыняцці рашэнняў па такой важнай экалагічнай праблеме, як змяненне клімату.

Беларусь бярэ ўдзел у міжнароднай кліматычнай кампаніі, што павышае яе рэйтынг на міжнародным узроўні, таму ў нашай краіне "Зялёнаму пальцу" надаецца асаблівая ўвага.

Паводле слоў Наталлі Парэчынай, каардынатара рабочай групы "Беларусь і клімат", людзі з ахвотай удзельнічаюць у акцыі. "Галоўная наша група — моладзь. Яны больш крэатыўныя і лёгкія на пад'ём. Шмат акцый праводзіцца непасрэдна ў ВНУ. Пакуль цяжка палічыць, колькі ўжо сабрана фотаздымкаў. Але ўжо бачна, што найбольш актыўныя ўдзельнікі — Гродзенская і Брэсцкая вобласці, а таксама Мінск".

Першымі на заклік адгукнулася моладзь з Гродна. Актывісты нават знялі невялікі ролік пра тое, як праходзіла акцыя.

Пасля гродзенцаў буйная акцыя "Зялёны палец" разгарнулася ў Міжнародным дзяржаўным экалагічным універсітэце імя Сахарава. Цяпер усе "зялёныя" арганізацыі краіны на сваіх мерапрыемствах таксама фарбуюць пальцы зялёным.

Падобныя акцыі сёння ідуць і ў іншых краінах Еўропы, у Амерыцы. Пакуль што арганізатары акцыі задаволены ходам кампаніі. Вынік працы свет убачыць у канцы года. Плануецца сабраць больш за паўмільёна фотаздымкаў, потым скласці з постараў агульную ленту працягласцю ў некалькі кіламетраў і прывезці яе ў Капенгаген, на канферэнцыю бакоў, дзе будуць выносіцца рашэнні па праблемах хуткага змянення клімату і глабальнага пацяплення.

Такім чынам грамадскасць хоча паўплываць на палітыкаў, якія будуць прымаць канчатковае рашэнне па гэтым пытанні. Ёсць надзея, што такая акцыя дапаможа прадухіліць небяспечнае змяненне клімату, якое з кожным годам набірае моц. Асаблівая надзея на тое, што краіны з дапамогай гэтай акцыі ў найбліжэйшы час знізяць выкіды парніковых газаў, якія непакояць усіх эколагаў.

Прыемна, што Беларусь бярэ ўдзел у такой незвычайнай акцыі. Такая прапанова ўспрымаецца насельніцтвам з энтузіязмам. Нягледзячы на тое, што пасля давядзецца мыць рукі, людзі ахвотна згаджаюцца паўдзельнічаць. Прычым не толькі моладзь, але і сталыя людзі. На руцэ беларусы пішуць абсалютна розныя адказы: ад агульных прыродных каштоўнасцяў кшталту "лес", "зямля", "паветра" да асабістых. Варта адзначыць, што ўсе ўдзельнікі ставяцца да выбару слова, якое збіраюцца напісаць, з адказнасцю: разважаюць, узважваюць, што ж нам больш патрэбна. Хапае і арыгінальных адказаў. Адзін мужчына, напрыклад, старанна напісаў "цешча". Моладзь часцей за іншых не піша слова, а малюе гэтае паняцце. Ужо сабрана шмат фотаздымкаў з малюнкамі зялёных сонейкаў, кропелек ды сняжынак.

Далучайцеся і іншыя! Я сама паўдзельнічала ў такой акцыі. І калі малявала сваё слова на руцэ, насамрэч адчувала адказнасць за напісанае.

Спадзяёмся, што палітыкі і эколагі паглядзяць на твары тысяч беларусаў на міжнародным постары і наш народ таксама дапаможа памірыць чалавека і прыроду і спыніць глабальнае пацяпленне. А пакуль акцыя працягваецца.

***Вікторыя Церашонак***

**Источник:** Звязда.-2009.-5 чэрв.-С.3-4**.**